Чацвер, 29 Красавік 2021

10 і 20 сутак арышту – прысуды за лампадкі ля храму ў Дзень чарнобыльскай трагедыі

Друкаваць (/news/sud/item/3981-za-lampadki-lya-khramu?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=9dae84b038b4813cd24072ca208cb832956eb136)

Ацаніць гэты матэрыял (7 галасоў)



(/media/k2/items/cache/c865d8ec4e84a21ba22c5a0c805e56fc_XL.jpg)

Ілюстрацыйнае фота

Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску разгледзеў 29 красавіка праз скайп справу Лізаветы Кірыенка і Марыі Амасовіч, якія ўжо трое сутак знаходзяцца за кратамі ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ). Як аказалася, іх затрымалі за лампадкі, якія яны запалілі ля царквы ў дзень Чарнобыльскай трагедыі. Суд прызнаў іх дзеянні несанкцыянаваным пікетаваннем (арт. 24.23 КаАП) і пакараў абедзвюх дзяўчат арыштам.

Аб'яднаную справу **Марыі Амасовіч** і **Лізаветы Кірыенка** разбіраў суддзя **Уладзімір Царыкаў**.

Паводле міліцэйскіх пратаколаў, Амасовіч і Кірыенка ўвечары 26 красавіка супольна зладзілі несанкцыянаванае пікетаванне, запаліўшы на прыступках Ўваскрасенскага храму ў Віцебску дзве лампадкі чырвонага колеру. Супрацоўнік Кастрычніцкага РАУС **Віталь Праліч**, які складаў пратаколы, палічыў, што тым самым дзяўчыны публічна выказалі свае грамадска-палітычныя інтарэсы і парушылі заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (**арт. 24.23 КаАП**). Пасля затрымання і складання пратаколаў дзяўчыны былі кінутыя за краты ІЧУ, дзе правялі ўжо трое сутак.

> Марыя Амасовіч і Лізавета Кірыенка сваёй віны не прызналі. Па словах падсудных, яны паставілі і запалілі лампадкі толькі з адной мэтай – ушанаваць памяць ахвяр катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Абедзве сцвярджалі, што ніякіх *«грамадска-палітычных поглядаў»* пры гэтым не выказвалі. Тым больш – публічна.

«Каля храму на той момант нават мінакоў мы не бачылі», – сказала на судзе Амасовіч.

Адвакатка прасіла спыніць справу

Як вынікала з рапартаў супрацоўнікаў МУС, дзяўчаты былі затрыманыя пасля таго, як пра запаленыя ля царквы лампадкі міліцыянтам паведаміў нібыта звычайны грамадзянін **Ібрагімаў**. Адвакатка Лізаветы Кірыенка хадайнічала, каб гэты грамадзянін быў апытаны ў судзе ў якасці сведкі, але суддзя хадайніцтва не задаволіў.

На погляд адвакаткі, сам прыход да храму яе падабароннай не даказвае, што яна ўдзельнічала ў пікетаванні. І мэтай яе дзеянняў было зусім іншае, а менавіта – ушанаванне памяці. Абаронца прасіла суд скасаваць адміністрацыйную справу праз адсутнасць складу правапарушэння.

> Суддзя Уладзімір Царыкаў палічыў інакш. Ён пастанавіў прызнаць дзеўчын вінаватымі ў парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і пакараць Лізавету Кірыенка **10 суткамі адміністрацыйнага арышту** (ч.1 арт. 24.23 КаАП), а Марыю Амасовіч – **20 суткамі** (ч.3 арт. 24.23 КаАП).

Ператрус на кватэры Лізаветы

Стала таксама вядома, што ў кватэры, якую здымае ў Віцебску Лізавета Кірыенка, напярэдадні суду **прайшоў ператрус**. Яго ўчынілі ў межах крымінальнай справы, распачатай паводле арт. 341 КК (але Лізавета ніякага статусу ў справе не мае). Канфіскавалі тэлефон і ноўтбук.

Лізавета Кірыенка мае 23 гады. Ужо 4 гады працуе ў Віцебску выхавальніцай у дзіцячым садку, завочна атрымлівае вышэйшую адукацыю (гістфак). 19-гадовая Марыя Амасовіч – навучэнка 1-га курсу аднаго з віцебскіх ліцэяў.

Зміцер Міраш

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: артыкул 2423 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%202423%20КаАП) Марыя Амасовіч (/itemlist/tag/Марыя%20Амасовіч) Лізавета Кірыенка (/itemlist/tag/Лізавета%20Кірыенка) Уладзімер Царыкаў (/itemlist/tag/Уладзімер%20Царыкаў)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Вынесеныя прысуды за абразу міліцэйскага чыноўніка і кіраўніка дзяржавы (/news/sud/item/3963-vynesenyya-prysudy-za-abrazu-militsejskaga-chynounika-i-kiraunika-dzyarzhavy) «Укусіла міліцыянта за палец». У Віцебску пачаўся чарговы працэс за гвалт да супрацоўнікаў МУС » (/news/sud/item/3986-ukusila-militsyyanta-za-palets)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3981-za-lampadki-lya-khramu#startOfPageId3981)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/)